РАШЭННЕ
калегіі ўпраўлення культуры
Брэсцкага аблвыканкама

25.03.2019 г. № 3

г. Брэст

Аб выніках абласнога тура
XXVII рэспубліканскага агляду-конкурсу
«Бібліятэка – асяродак нацыянальнай
культуры»

Краязнаўства, гісторыка-культурная спадчына з'яўляюцца спрадвечнымі крыніцамі фарміравання нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва. Для ўзмацнення ролі публічных бібліятэк у зборы, захаванні і папулярызацыі інфармацыйных рэсурсаў па краязнаўстве, нацыянальнай гісторыі, літаратуры, мове, народнай культуры сярод розных чытацкіх катэгорый у вобласці праводзіцца чарговы тур рэспубліканскага штогадовага агляду-конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры».

На абласны тур XXVII рэспубліканскага агляду-конкурсу былі прадстаўлены 12 матэрыялаў ад наступных бібліятэк: Баранавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Я.Чачота ДУК «Баранавіцкая РЦБС», Пінская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я.Янішчыц ДУК «Пінская РЦБС», Пелішчанская сельская бібліятэка ДУК «Камянецкая РБС», Стрыгінская сельская бібліятэка ДУК «Бярозаўская РБС», Мельніцкая сельская бібліятэка ДУК «Маларыцкая РЦБС», Іванаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф.Панфёрава ДУК «Іванаўская ЦРБ імя Ф.Панфёрава», ДУК «Ляхавіцкая РЦБС», ДУК «ЦБС г. Баранавічы», Аброўская сельская бібліятэка ДУК «Івацэвіцкая РБС», Закозельская сельская бібліятэка ДУК «Драгічынская РЦБС», Ганцавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя В.Праскурава ДУК «Ганцавіцкая РЦБС», Лунінецкая цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Лунінецкая РЦБС».

Матэрыялы, прадстаўленыя ў абласны аргкамітэт, уключалі: заяўку, інфармацыйную і аналітычную даведкі, дадаткі ў выглядзе інфармацыйных і бібліяграфічных матэрыялаў, метадычных распрацовак, рэкламнай і выдавецкай прадукцыі, электронных матэрыялаў і г.д. Аналіз дасланых матэрыялаў паказаў, што ў рабоце бібліятэк значнае месца займае збор і захаванне друкаваных і неапублікаваных матэрыялаў пра гісторыю роднага краю і помнікі архітэктуры, папулярызацыя беларускай мовы, літаратуры, народных традыцый, творчасці пісьменнікаў-землякоў, услаўленне знакамітых ўраджэнцаў.

Разглядзеўшы конкурсныя матэрыялы і заслухаўшы інфармацыю дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М.Горкага Стрыжэвіч А.Я., калегія ўпраўлення культуры ВЫРАШЫЛА:

1. Прызнаць пераможцамі абласнога тура і прадставіць для ўдзелу ў XXVII рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»:

У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу»:
- ДУК «Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Пляшэвіч Вольга Анатольеўна) – сярод гарадскіх бібліятэк; за плённую пошукавую і даследчую працу па вывучэнні, сістэматызацыі і захаванні этнаграфічных, тапанімічных, фальклорных матэрыялаў аб раёне; стварэнне электроннага рэсурсу «Невядомае аб вядомым: цікавыя факты аб Ляхавіччыне» і яго папулярызацыю ў віртуальным асяроддзі;
- Стрыгінскую сельскую бібліятэку ДУК «Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма» (бібліятэкар Пунько Святлана Мікалаеўна) – сярод сельскіх бібліятэк; за высокі ўзровень пошукавай краязнаўчай дзейнасці, вывучэнне, захаванне і папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны Бярозаўшчыны, стварэнне ўнікальных краязнаўчых матэрыялаў на папяровых і электронных носьбітах;

У намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»:
- Ганцавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя В.Праскурава ДУК «Ганцавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Хваль Ала Уладзіміраўна) – сярод гарадскіх бібліятэк; за крэатыўны і наватарскі падыход да рэалізацыі творчых праектаў, арганізацыю раённага конкурсу прафесійнага майстэрства па стварэнні лепшага бібліятрансформера «Новае ў бібліятэцы»;

У намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання»:
- Іванаўскую цэнтральную раённую бібліятэку імя Ф.Панфёрава (дырэктар Данількевіч Алена Іванаўна) – сярод гарадскіх бібліятэк; за сістэмную і мэтанакіраваную работу па далучэнні да чытання розных слаёў насельніцтва праз рэалізацыю бібліятэчнай праграмы «Пісьменства і друк Беларусі –крыніца культуры і духоўнасці народа», прымеркаванай да Дня беларускага пісьменства;
- Баранавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я.Чачота ДУК «Баранавіцкая раённая цэнтралізаванная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Лайша Таццяна Міхайлаўна) – сярод бібліятэк, абслугоўваючых сельскае насельніцтва; за мемарыяльную і выхаваўчую дзейнасць бібліятэкі праз рэалізацыю краязнаўчых праграм «Наталенне Радзімай» і «Ян Чачот. Non stop».

У намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»:
- ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы» (дырэктар Рудкоўская Таццяна Аляксандраўна) – сярод гарадскіх бібліятэк; за высокі ўзровень культурна-асветніцкай дзейнасці, накіраванай на выхаванне нацыянальнай самасвядомасці ў маладога пакалення; папулярызацыю беларускай літаратуры і правядзенне гарадскога свята кнігі «Маіх радкоў няма без Беларусі».
- Мельніцкую сельскую бібліятэку ДУК «Маларытская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (бібліятэкарКівачук Наталля Сяргееўна) – сярод сельскіх бібліятэк; за шматгранную дзейнасць у патрыятычным выхаванні, духоўнай асвеце падрастаючага пакалення; стварэнне гісторыка-краязнаўчага рэсурсу «Малая радзіма: краязнаўчы маршрут па вёсцы Мельнікі».

2. Узнагародзіць Дыпломамі пераможцаў:
- ДУК «Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;
- Стрыгінскую сельскую бібліятэку ДУК «Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма»;
- Ганцавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя В.Праскурава ДУК «Ганцавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;
- ДУК «Іванаўскую цэнтральную раённую бібліятэку імя Ф. Панфёрава»;
- Баранавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я. Чачота ДУК «Баранавіцкая раённая цэнтралізаванная бібліятэчная сістэма»;
- ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы»;
- Мельніцкую сельскую бібліятэку ДУК «Маларытская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».

3. Адзначыць Лістамі падзякі:
- Закозельскую сельскую бібліятэку ДУК «Драгічынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (бібліятэкар Свіціч Тацццяна Сцяпанаўна) – за плённую пошукавую дзейнасць па захаванні і папулярызацыі матэрыялаў аб Э.Ажэшка, стварэнне інфармацыйнага матэрыялу «Некаранаваная каралева: жыццёвы і творчы шлях Э.Ажэшка на Драгічыншчыне»;
- Лунінецкую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Лунінецкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Кішкевіч Алена Васільеўна) – за новыя падыходы да папулярызацыі творчасці мясцовых пісьменнікаў і стварэнне інфармацыйнага рэсурсу «Літаратурная карта Лунінеччыны»;
- Пінскую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Анташук Алена Іванаўна) – за плённую і шматгранную работу па папулярызацыі творчасці мясцовых пісьменнікаў праз дзейнасць клуба «Пінчукі»;
- Пелішчанскую сельскую бібліятэку ДУК «Камянецкая раённая бібліятэчная сістэма» (загадчык філіялам Жукава Жана Яўгенаўна) – за сістэмную работу па распаўсюджванні краязнаўчых ведаў, выхаванні патрыятызму ў дзяцей і моладзі; фарміраванне экалагічнай культуры шляхам арганізацыі культурна-асветніцкіх праектаў і акцый.

4. Кантроль за выкананнем рашэння ўскласці на дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М.Горкага Стрыжэвіч А.Я.

Старшыня калегіі,
начальнік упраўлення культуры
Брэсцкага аблвыканкама С.Б.Панасюк